# Школьная планета

*НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!*

***№ 9 (65) МАЙ 2020***

*Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці*



# У добры шлях, выпускнікі!





# Беларусь памятае

**У рамках святкавання 75-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ва ўстанове адукацыі была арганізавана выстава пад агульнай назвай "Беларусь памятае", а таксама выстава творчых работ «Вянок славы».**

У гонар юбілейнай даты на выставе творчых работ «Вянок славы» у рамках рэспубліканскага фестывалю-конкурсу творчасці дзяцей і моладзі можна было ўбачыць мемарыяльныя вянкі, створаныя нашымі вучнямі ў розных тэхніках. Напярэдадні майскага свята вянкі разам з жывымі кветкамі школьнікі ўсклалі да брацкіх магіл савецкіх воінаў і партызан на гарадскіх могілках і ў скверы Так юныя патрыёты аддалі даніну павагі тым, хто загінуў, змагаючыся за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.



Адзін з раздзелаў выставы «Беларусь памятае» быў прысвечаны настаўнікам нашай школы, якія змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў; другі – адважным піянерам героям; трэці раздзел «Зорачка на карце горада Беразіно» распавядаў аб воінскіх пахаваннях на тэрыторыі горада.







Не засталіся без увагі і ветэраны-удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Хлопцы разам з педагогамі ўручылі ім памятныя сувеніры, кветкі, віншавальныя лісты-трыкутнікі. З вуснаў непасрэдных удзельнікаў падзей тых гадоў школьнікі даведаліся аб крывапралітнай вайне, пра гора і нястачы ваеннага часу. Ведаючы пра тое, што такое вайна, яны яшчэ мацней задумаліся над тым, як важна берагчы мір на ўсёй планеце.



*Дом, у якім утульна ўсім!*

berezino2.school.by № 9 (65) МАЙ 2020

# З удзячнасцю да роднай школы

**Як хутка ляціць час! Мінула 11 гадоў вучобы. Нядаўна празвінеў апошні званок. На тварах бацькоў - слёзы і ўсмешкі, настаўнікі горда распраўляюць плечы, праводзячы ўчарашніх вучняў. Мы, выпускнікі, з удзячнасцю і светлым смуткам глядзім на родныя сцены любімай школы.**



Тут мы рабілі свае першыя крокі на шляху да поспеху, да светлай будучыні. У нас былі як узлёты, так і падзенні, але мы заўсёды ведалі, што можам спадзявацца і ў школе, і ў жыцці на вас, нашых настаўнікаў. Вы бачылі нашы таленты і дапамагалі іх раскрыць: хтосьці з азартам вырашаў складаныя матэматычныя задачкі, хтосьці зачытваўся творамі рускіх класікаў, хтосьці ўдумліва разбіраўся з гістарычнымі датамі, а нехта з задавальненнем выступаў на сцэне.



Для больш глыбокага вывучэння асобных прадметаў былі адкрыты профільныя класы, працавалі групы "Уводзіны ў педагагічную прафесію" і "Уводзіны ў аграрную прафесію", тэрмін навучання ў якіх складае два гады. Яны не толькі даюць дадатковыя веды аб абранай спецыяльнасці, але і дазваляюць паступаць без ЦТ у вышэйшую навучальную ўстанову.

Напрыклад, Дзмітрый Чарнаморцаў будзе залічаны студэнтам Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. Ён кажа пра гэта так: "З дзяцінства ў мяне была мара звязаць сваё жыццё з сельскай гаспадаркай. Я займаюся развядзеннем пчол і хачу працягнуць свой занятак. Агракласс дазволіў мне трапіць у профіль і даў магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю".





Наталля Пянкрат, якая натхнілася прыкладам сваёй першай настаўніцы Ірыны Пятроўны Долбінай, вырашыла стаць настаўнікам пачатковых класаў. Вось што яна распавяла пра педагагічную групу, дзе займалася: "Педгрупа дазваляе паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову, звязаную з педагагічнай дзейнасцю.



Для гэтага трэба сабраць партфоліа, якое адлюстроўвае тваё асабістыя дасягненні, і прайсці субяседванне. Гэта выдатны шанец для таго, хто марыць звязаць сваё жыццё з настаўніцкай працай. У педгрупе вы можаце атрымаць веды аб тым, як правільна выходзіць са складаных сітуацый, як ацаніць сваю працу ў якасці настаўніка, а таксама яна спрыяе асобаснаму росту".

У пачатку дзясятага класа мы толькі-толькі пачалі пазнаваць адзін аднаго і сталі сапраўднай камандай, дзякуючы нашаму класнаму кіраўніку Галіне Уладзіміраўне Баброўскай. Цяпер мы жывем пад дэвізам: "За мяне б'еццa кожны, за кожнага б'юся я". Яна дорыць нам сваю падтрымку і верыць у нашы мары, кажа, што мы ўсяго дасягнём, таму што мы - лепшыя. Знаходзячыся побач з ёй, мы адчуваем сябе сям'ёй.



Словы падзякі класным кіраўнікам гучаць у гэтыя дні таксама ў адрас Аляксандра Віктаравіча Чахольскага і Таццяны Ігараўны Капанец.

Каманда КВЗ “Па барабану” удзячная свайму нязменнаму кіраўніку Івану Пятровічу Яфрэменка, які запаліў зорку таленту ў кожным з удзельнікаў, вядомай у вобласці камандзе вясёлых і знаходлівых.





**Уся педгрупа выказвае падзяку свайму кіраўніку - Галіне Анатольеўне Наглай, якая перадавала нам жыццёвы вопыт і мудрасць, паказала, якім павінен быць сапраўдны настаўнік. Дзякуй ёй за гэтыя два цудоўныя гады!**





**Дзякуй кожнаму настаўніку, які быў з намі на працягу ўсіх школьных гадоў, дзякуй намеснікам дырэктара, работнікам сталовай, тэхперсаналу. Асобная падзяка дырэктару нашай установы адукацыі Святлане Віктараўне Абрамовіч, якая прыкладае шмат намаганняў, каб наша школа стала ўтульным месцам для кожнага вучня і педагога.**

**МЫ ЦЭНІМ ВАС!**





***Развіталіся са школай выпускніцы 2020 года Наталля Пянкрат і Вікторыя Лапцёнак***



### *Дорогие ребята!*

Вот и остановили свой ход для ВАС школьные часы, которые одиннадцать лет отсчитывали ВАШЕ ученическое время – время побед и поражений, время радостных открытий и проверки себя…

Сегодня мы, педагоги, прощаемся с ВАМИ, выпускники 2020 года! И не только мы, но и сама школа: ее классы и коридоры, актовый и спортивный залы; ее светлые окна, её двор также прощаются с вами…С ВАМИ, кто является олицетворением ЕЁ чести, достоинства, интеллекта, творчества, креативности, ее побед и свершений за последние два-три года.

Я со светлой грустью, волнением и радостью распахиваю перед ВАМИ школьные двери во взрослую жизнь: надеюсь, что, выпорхнув за порог нашей родной школы, ВЫ полетите навстречу своему счастью, проникнутые любовью ко всему общечеловечески ценному на Земле; горящие желанием созидать, стремлением претворить свою мечту в жизнь, способностью видеть красоту и беречь её!

Я верю в каждого из ВАС и желаю, чтобы ВЫ крепко встали на ноги, никогда в жизни не потеряли своего лица, не уронили чести и достоинства. Удачи ВАМ, счастливого студенчества, родительского понимания и поддержки!

С верой в себя, надеждой и любовью ко всему, к чему прикасаются ВАШИ ум, сердце, руки, смело вступайте во взрослую жизнь! В добрый путь, наши дорогие дети!

***Из напутственного обращения директора учреждения образования Абрамович С.В. к выпускникам 2020 года***



**Залатыя медалісткі**
**Вікторыя Лапцёнак і Ганна Лукашык**

*Дом, у якім утульна ўсім!*
**berezino2.school.by** ***№ 9 (65) МАЙ 2020***

# Алея выпускнікоў-2020: нараджэнне традыцыі

**30 мая школьны званок прагучаў для выпускнікоў у апошні раз на ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным заканчэнню школы. Школьнае жыццё даўжынёю ў адзінаццаць гадоў падалося ўсяго толькі яркім імгненнем, якое завершыцца з апошнімі гукамі вальса ў чэрвені. А напярэдадні развітальнага школьнага званка адзінаццацікласнікі заклалі «Алею выпускнікоў», якая (яны ў гэтым перакананыя) пакладзе пачатак цудоўнай традыцыі і зробіць двор ўстановы адукацыі яшчэ больш прыгожым.**



На развітанне ў падзяку роднай школе адзінаццацікласнікі разам з класным кіраўніком і першай настаўніцай высадзілі на школьным двары туі і кветкі. Сваімі высілкамі і стараннямі хлопцы і дзяўчаты зрабілі тэрыторыю школы яшчэ больш прыгожай. Тым самым яны паклалі пачатак добрай традыцыі. З часам памацнеюць пасаджаныя імі дрэўцы і ў будучыні нагадаюць аб незабыўных школьных гадах. А распачатую справу працягнуць будучыя выпускнікі...







Наперадзе ў сённяшніх выпускнікоў - цэлае жыццё, новыя перспектывы і далягляды. Жадаем усім выпускнікам поспехаў заўсёды і ва ўсім, здзяйснення запаветных мараў. Мы спадзяемся, што ваш лёс будзе шчаслівым; што і праз гады вы будзеце прыходзіць на спатканне з роднай школай, не забудзеце сваіх школьных сяброў і настаўнікаў. А нагадваць школе пра вас будзе пасаджаная вамі алея, якая ўздужае праз пэўны час. **У добры шлях, выпускнікі!**

# Бывай, пачатковая школа!

**Святочныя мерапрыемствы, як і ў ранейшыя гады, прайшлі не толькі для вучняў 9-х і 11-х класаў, але і для тых дзетак, якія скончылі ў гэтым годзе пачатковую школу. Класныя кіраўнікі 4-х класаў Таццяна Мікалаўена Фядотава і Ірына Уладзіміраўна Шаграй падрыхтавалі святочную праграму для сваіх гадаванцаў.**

I хоць прайшло мерапрыемства даволі камерна, без бацькоў і ў сценах класа (а не актавай залі), тут знайшлося месца смеху і гумару, слязам расстання вучняў з любімым класным кіраўнікам, а таксама добрым словам пажаданняў і абаяцанняў дастойна вучыцца, дасягаць новых вяршыняў.






Вершы, жартаўлівыя сцэнкі, песні, танцы, гульні, салодкія пачастункі, кветкі, падзячныя лісты бацькам і, канешне, стос першых сапраўдных школьных дакументаў – дыпломаў аб заканчэнні першай ступені адукацыі – стварылі неабходную атмасферу свята, радасці і ўрачыстаці, утульнасці і душэўнай цеплыні.



## Віншуем хлопчыкаў і дзяўчынак з заканчэннем I ступені адукацыі !



### Жадаем здароўя, шчасця, поспехаў у вучобе!

P.S. Улічваючы эпідэміялагічную сітуацыю ў краіне, ва ўстанове адукацыі ў час правядзення святочных мерапрыемстваў былі праведзены ўсе неабходныя санітарна-супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы па недапушчэнні распаўсюджвання інфекцый.



Так кожнаму з бацькоў на ўваходзе было памерана тэмпература бескантактным тэрмометрам, а таксама прапанававаліся маскі і пальчаткі, якія можна было апрануць пры жаданні, а таксама вымыць рукі дэзсродкам. Такія меры былі неабходныя, аднак яны ніколькі не сапсавалі цудоўнага настрою ў час правядзення ўрачыстасцей.

# Вынікі працы за год падведзеныя

**Вынікі сур'ёзнай карпатлівай працы заўсёды маюць адпаведную адзнаку з боку кіраўніцтва школы і раёна. Вучні, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у алімпіядным руху, шматлікіх абласных, рэспубліканскіх конкурсах, спартыўных мерапрыемствах, атрымалі дыпломы і грашовыя ўзнагароды на лінейках, прысвечаных заканчэнню навучальнага года.**









Першыя ўзнагароды вучняў 1-х класаў за высокія дасягненні ў школьнай навуцы яшчэ наперадзе. Іх першая і галоўная задача была навучыцца лічыць, пісаць і, канешне, чытаць. Таму для іх было наладжана святочнае мерапрыемства,якое азнаменавала сабой развітанне з самай першай галоўнай кнігай у жыцці азбукай. Дзеткі пад кіраўніцтвам першай настаўніцы зрабілі важкі крок у сваім развіцці – яны навучыліся чытаць. Чытанне ж, як вядома, адкрывае для чалавека цэлы свет ведаў. Жадаем, каб у будучым вы прачыталі як мага больш цікавых кніг і меней трымалі ў руках электронныя гаджэты для забавы. Магчыма, толькі пры сурь'ёзным, удумлівым чытанні кніг народзяцца думкі, складзецца глыбокі позірк на сябе і свет, адкрыюцца новыя далягляды.

**Наперадзе ў вучняў і педагогаў летнія канікулы. Жадаем усім правесці гэты час весела, займальна, на пазітыве, не забываючыся пра правілы бяспекі. Няхай ўсё спрыяе вашаму цудоўнаму адпачынку!**




## ВІНШУЕМ З ПАЧАТКАМ ЛЕТНІХ КАНІКУЛ!


| | | |
|---|---|---|
| ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино» | ДУА "Сярэдняя школа №2 г. Беразіно" 223311 вул. Мультана, 19 Электронная пошта berezinosch2.edu@tut.by<br><br>Сайт школы berezino2.school.by | Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц. Над выпускам працавалі ўдзельнікі клуба "Юны журналіст": Бурая Анастасія, Губчэўская Кацярына, Лукашэвіч-Рыбачонак Лізавета, Морская Яна, Рафальская Аляксандра, Радзевіч Аліна і інш. |